**КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**Жнівень–верасень**

*Інфармацыйнае паведамленне*

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Інфармацыйнае паведамленне*



ЖНІВЕНЬ – ВЕРАСЕНЬ

Віцебск 2014

шумілінцы атрымалі адразу 4 узнагароды. У намінацыі “Народныя інструменты” званне лаўрэата II ступені прысуджана Ксеніі Храмцовай, I ступені – Елізавеце Дзямінавай, Гран-пры ў Вольгі Скарынавай. Ансамбль “Чароўныя музыкі” стаў лаўрэатам II ступені ў намінацыі “Інструментальныя ансамблі”.

*Витебский проспект. – 2014. – 28 авг. – С. 23.*

З **4** па **6 ліпеня** ў г. Вентспілсе (Латвія) прайшлі дні беларускай культуры “Ад Ліга да Купалы”. Удзел у святочных мерапрыемствах прынялі народны цырк г. Наваполацка “Юность”, ансамблі “Заманіха” і “Субацея”, тэатр гістарычнага касцюма “Звяз” (г. Полацк).

*КІНАМАСТАЦТВА*

У Беларусі **24–28 жніўня** адбыўся **X Міжнародны каталіцкі фестываль хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграм “Magnificat-2014”**. Першы дзень форуму па традыцыі прайшоў у Мінску, наступныя – на тэрыторыі Глыбоцкага раёна. У гэтым годзе ўпершыню конкурсныя фільмы былі паказаны на заводах, фабрыках і сельскагаспадарчых прадпрыемствах Глыбоцкага раёна, а ў пасёлку Падсвілле мультыплікатары правялі майстар-клас.

*ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа прадставіў Беларусь на IV тэатральным фестывалі імя Фёдара Абрамава, які прайшоў у г. Архангельску (Расійская Федэрацыя) з **19** па **25 верасня**. На вялікай сцэне Архангельскага тэатра драмы імя Ламаносава коласаўцы прадставілі трагікамедыю “Пахавайце мяне за плінтусам” па аповесці расійскага пісьменніка П. Санаева. Пастаноўка – заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, дырэктара – мастацкага кіраўніка Коласаўскага тэатра В. Анісенкі. Па выніках фестывалю журы адзначыла заслужаную артыстку Беларусі Тамару Скварцову “За псіхалагічную праўду вобраза ў сцэнічным увасабленні сучаснай прозы”.

*http://kolastheatre.by/ru/news/kolasovskiy-teatr-na-festivale-rodnikovoe-slovo-v-arhangelske*

**28 верасня** Беларускі тэатр “Лялька” адкрыў свой 29-ы сезон спектаклем для маленькіх паводле шведскіх казак “Цудоўная скрыня з зялёным гарошкам”.

*http://www.lialka.by/bel/*

*МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК*

У **чэрвені** прайшоў II Міжнародны конкурс “Музыкальный вернисаж”, арганізаваны асацыяцыяй педагогаў музыкантаў г. Магнітагорска і Чалябінскай вобласці (Расійская Федэрацыя), на якім



ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Жнівень–верасень**

*Інфармацыйнае паведамленне*

ВІЦЕБСК
2014

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *Н. А. Пугачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

**Культурнае** жыццё Віцебскай вобласці : жнівень–верасень : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2014. – 26 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2014

*ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА*

“Волшебный мир детства” – пад такой назвай у культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”» экспанавалася выстаўка работ членаў клуба аматараў вышыўкі “Волшебная нить”.

*Витебские вести. – 2014. – 16 авг. – С. 16.*

У культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”» ў **верасні** прайшла прэзентацыя альбома-кнігі “Людмила и Валерий Ковальчук – керамисты из Витебска”.

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 25 сент. – С. VI.*

З **5 па 25 верасня** ў выставачнай зале ДУ “Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” працавала выстаўка народнага клуба народных майстроў і мастакоў-аматараў Талачынскага Дома рамёстваў “Карагод талентаў”. У экспазіцыі былі прадстаўлены лепшыя творы майстроў і мастакоў-аматараў клуба за апошнія 3 гады па напрамках: выцінанка, вышыўка, ткацтва, разьба па дрэве, саломапляценне, ганчарства, корнепластыка, бісерапляценне, лозапляценне і іншых відах мастацтва.

*Віцебскі АМЦНТ*

*РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна*

У Аршанскім этнаграфічным музеі “Млын” была прадстаўлена выстаўка работ самадзейных майстроў г. Оршы (гліняная лялька, лялька-тыльда, лялька ў народных строях і інш.). У верасні ў музеі таксама экспанавалася міжнародная выстаўка работ самадзейных майстроў *Таісы* і *Генадзя Юр’евых* (г. Вялікія Лукі, Расійская Федэрацыя; жывапіс поўсцю і маркетры).

*Аршанская газета. – 2014. – 20 верас. – С. 5.*

дзякуючы гранту Фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва і з'яўляецца вынікам шматгадовай працы навукоўцаў, рэстаўратараў і музейных супрацоўнікаў.

*http://polotsk.museum.by/node/35983*

Мемарыяльная дошка ўдзельніку партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герою Сацыялістычнай Працы, заслужанаму работніку прамысловасці БССР, дэпутату Вярхоўна Савета СССР, Ганароваму грамадзяніну горада Віцебска *Міхаілу Севасцьянавічу Цітову* ўсталявана ў **верасні** на сцяне дома № 5 па вуліцы Касманаўтаў. Яе аўтар – віцебскі скульптар Азат Тарасян.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 25 сент. – С. 2.*

## МАСТАЦТВА

*ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

У Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку ў **жніўні** экспанавалася выстаўка работ мастака Навукова-тэхнічнага цэнтра Рэспублікі Беларусь *Галіны Валер'еўны Горавай* "Касмічнае падарожжа" (*пейзажы*).

*http://www.pvestnik.by/?p=17475*

**8 жніўня** ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі імя В. Грамыкі адкрылася міжнародная выстаўка акварэлі *Святланы Вячэрскай* "Возвращение" (г. Масква, Расійская Федэрацыя).

У Мастацкім музеі г. Віцебска была прадстаўлена фотавыстаўка мінчаніна *Дзяніса Раманюка* "Беларусь синеокая".

*Витебский проспект. – 2014. – 21 авг. – С. 16.*

Медыйная выстаўка арт-групы "ЧреВо" (г. Краснаярск, Расійская Федэрацыя) "ПО УМОЛЧАНИYOU" працавала ў **жніўні** ў Мастацкай галерэі г. Полацка. Праект аб'яднаў лепшыя і апошнія маналогі аб канвееры паўсядзённасці, бязлітаснай шаблоннасці і цудоўнай адзіноце.



## ЗМЕСТ

**ПРАДМОВА**……………………………………………………………4

**ХРОНІКА ПАДЗЕЙ**

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне………………………………………………………………..5

## ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 жніўня па 30 верасня 2014 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Міёрскага райвыканкама, РМЦ НТ і КАР Талачынскага раёна, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Полацкай, Ушацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.



З **2 ліпеня** ў Музеі беларускага кнігадрукавання дзейнічала выстаўка “Навекі ў памяці…”, на ёй экспанаваліся навуковыя, навукова-папулярныя і мастацкія выданні, прысвечаныя трагічным і гераічным падзеям Вялікай Айчыннай вайны. У Музеі баявой славы працавала выстаўка “Великая Победа. Память без срока давности”. Абедзьве экспазіцыі прысвечаны 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

*http://book.polotsk.museum.by/node/35643*

У **жніўні** ўбачыла свет кніга дырэктара музея Марка Шагала *Людмілы Хмяльніцкай* “Сигизмунд Юрковский – фотограф из Витебска”.

*Витебский проспект. – 2014. – 28 авг. – С. 22.*

**26 верасня** ў Гомелі пачаў работу II Нацыянальны форум “Музеі Беларусі”. Праграмная тэма сёлетняга з’езда “Музей и общество – от коммуникации к взаимодействию”. Сем музеяў Віцебшчыны прынялі ўдзел у форуме: Браслаўскі, Лепельскі, Аршанскі, Глыбоцкі, а таксама Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. Абласны краязнаўчы музей прадставіў на аснове фондавых рарытэтных фатаграфій экспазіцыю, прысвечаную 1040-годдзю Віцебска. Музей Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова заявіў пра сябе выстаўкай па гісторыі ваеннага касцюма перыяда Першай сусветнай вайны.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 25 сент. – С. 7.*

“Мстислав Добужинский. Театральные костюмы и декорации” – выстаўка са збору Літоўскага музея тэатра, музыкі і кіно адкрылася ў **верасні** ў Арт-цэнтры Марка Шагала.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 25 сент. – С. 2.*

У Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка пачала працаваць стацыянарная выстаўка манументальнага жывапісу, знятага са сцен храма Спаса-Праабражэння ў г. Полацку. Гэта стала магчымым пасля праведзеных рэстаўрацыйных работ, мэтай якіх было раскрыццё фрэскавага жывапісу XII ст. і захаванне некалькіх слаёў алейнага жывапісу XVIII–XIX стст. Выстаўка створана

З **22 верасня** па **12 кастрычніка** прайшоў фестываль кнігі “Эта книжная страна” (*Новалукомльская дзіцячая бібліятэка)*.

***Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк***

У **чэрвені** ў *Іллюшынскай сельскай бібліятэцы* адбыўся тыдзень экалогіі, у рамках якога былі праведзены мерапрыемствы: конкурс вырабаў з пластыкавых бутэлек “Отходы – в доходы”, экалагічная гадзіна “Земля защиты просит у людей”, бібліятэчная выстаўка “Давайте беречь нашу планету!”, гадзіна міласэрнасці “Не оставайтесь равнодушными!” (да Сусветнага дня бяздомных жывёл) і інш.

***Шаркаўшчына раённая сетка публічных бібліятэк***

**10 жніўня** Літаратурна-музычная вечарына “Добру все возрасты покорны” (*Ручайская сельская бібліятэка*).

Супрацоўнікі *цэнтральнай раённай бібліятэкі* на працягу **жніўня** арганізавалі чытальную залу ля гардскога фантана пад назвай “Ах, лето, было книгами согрето”.

**1 верасня** Пазнавальна-забаўляльная праграма “Школьные годы чудесные” (*дзіцячая бібліятэка*).

***Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**28 жніўня** Сустрэча з урачом раённай паліклінікі “Праблемы вашага здароўя” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**14 верасня** Гульня-экскурсія для вучняў 1–6 класаў “Сюды прыходзяць дзеці даведацца пра ўсё на свеце” (*Светласельская сельская бібліятэка*).

*МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ*

Выстаўка работ віцебскай мастачкі *Антаніны Пракоф’евай* пад назвай “Мораль сей басни такова” адкрылася ў Краязнаўчым музеі г. Віцебска (*мяккая цацка*).

*Витебский проспект. – 2014. – 14 авг. – С. 16.*





## КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

### КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў у **жніўні** наведаў Шумілінскі раён. Ён правёў “прамую лінію” з насельніцтвам. У інтэрв’ю журналістам міністр культуры звярнуў увагу на кадравую аптымізацыю ў сферы культуры. Міністр наведаў Шумілінскую школу мастацтваў, азнаёміўся з арганізацыяй вольнага часу ў аграгарадку Мікіціха, пабываў у г. п. Обаль і наведаў абноўлены музей камсамольскай славы.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 23 авг. – С. 2.*

**5 жніўня** ў Лёзненскім раёне адбылося выязное пасяджэнне прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў, на якім разглядалася работа, што праводзіцца ў рэгіёне па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, аб’ектаў вытворчага і сацыяльна-культурнага прызначэння. Удзельнікі пасяджэння прынялі ўдзел у адкрыцці на цэнтральнай плошчы гарадскога пасёлка “Сунічнай брамы” – своеасаблівага брэнда рэгіёна. Таксама госці пабывалі ў Лёзненскім ваенна-гістарычным музеі, наведалі Дом культуры ў в. Дабрамыслі. Вынікі выязнога пасяджэння падводзіліся ў Бабінавіцкім сельскім Савеце дэпутатаў, дзе адбылася прэзентацыя герба населенага пункта, які быў зацверджаны ўказам кіраўніка дзяржавы.

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 16 авг. – С. 2.*

*http://www.lioznonews.by/category/culture/*

Старшыня Віцебскага аблвыканкама А. Косінец у **жніўні** ўзгадніў назначэнне *Таццяны Мікалаеўны Адамян* на пасаду дырэктара ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна”.

*Витебский вестник. – 2014. – 28 авг. – С. 1.*

*КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

Дэлегацыя г. Наваполацка прыняла ўдзел у святкаванні дня нараджэння горада-пабраціма Лудзы (Латвія), які адзначаў 837-годдзе з **26 ліпеня** па **10 жніўня**. У святочных мерапрыемствах удзельнічаў танцавальны дуэт з г. Наваполацка ў складзе *Алега Яфрэменкі* і *Ганны Седлавец*. Салісты ўзорнага ансамбля бальнага танца “Менуэт” ДК ААТ “Нафтан” (кіраўнік *Ала Карніловіч*) прынялі ўдзел у міжнародным фестывалі “Солнечный дождь в Латгалии”.

*Новополоцк сегодня. – 2014. – 15 авг. – С. 3.*

**14 жніўня** ў г. Зарасаі (Літва) адбылося адкрыццё выстаўкі 27 карцін Юрыя Пэна з калекцыі Віцебскага абласнога музея (пейзажы, партрэты, эцюды). Выстаўка арганізавана ў рамках праекта “Дорога культуры евреев (изобразительное искусство): Юрий Пэн и его известные ученики”, аб’яднаўшага Літву, Латвію і Беларусь. Таксама юбілею майстра быў прысвечаны пяты пленэр “Зарасай – край озер-2014”. Ад г. Віцебска ўдзел у мерапрыемстве прынялі А. Духоўнікаў і Д. Гаралевіч.

*Витебский вестник. – 2014. – 12 авг. – С. 8.*

*Витьбичи=Віцьбічы. – 2014. – 26 авг. – С. 2.*

**16 жніўня** ў г. Гдоў Пскоўскай вобласці (Расійская Федэрацыя) адбыўся Міжнародны фальклорны фестываль “Гдовская старина”, у якім прыняў удзел народны ансамбль народнай музыкі Верхнядзвінскага РДК “Верхнядзвінскія музыкі”.

*Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2014. – 22 жн. – С. 6.*

У канцы **жніўня** ў г. Анапе (Расійская Федэрацыя) прайшоў IX Міжнародны фестываль Саюзнай дзяржавы “Творчество юных”, удзел у якім прыняў узорны ансамбль танца “ВИ-ЗА-ВИ” Дома культуры г. Оршы, і быў удастоены спецыяльнага прыза Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

*Телеком-экспресс (Орша). – 2014. – 25 сент. – С. 2.*



**23 жніўня** Гульнёвая конкурсная праграма “О здоровье знаю всё” (*Казлоўшчынская сельская бібліятэка*).

**14 верасня** Прамоўшэн-акцыя “Чытаць кнігі – гэта здарава!” (*Пастаўская цэнтральная раённая бібліятэка*).

**26 верасня** Духоўна-асветніцкая вечарына “К душе своей найди дорогу” з навучэнцамі Пастаўскага прафесійнага каледжа (*Пастаўская цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**11 жніўня** Відэавіктарына па казках Г.Х. Андэрсена “Волшебный зонтик” (*дзіцячая бібліятэка*).

**19 жніўня** Фальклорная гадзіна для дзяцей “Другі Спас – яблычак запас” (*Шпакоўшчынская сельская бібліятэка-клуб*).

**6 верасня** Літаратурнае свята “ЧитайГород!” з удзелам членаў беларускага літаратурнага саюза “Полоцкая ветвь” і музыканта *І. Палынскага*. У час мерапрыемства наведвальнікам былі таксама прапанаваны кніжная выстаўка “От мала до велика”, кансультацыі бібліятэрапеўта, юнацкая “Readers-тусоўка”, відэапаказ буктрэйлераў і інш.

***Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк***

У *Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэцы* ў **жніўні** прайшла конкурсна-гульнёвая праграма “Дзяцінства – цудоўная пара” для наведвальнікаў прышкольнага лагера.

Супрацоўнікі *Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі* і *Пламенскай сельскай бібліятэкі* прынялі ўдзел у раённым свяце “Як у Полымі тры Спасы адзначалі”.

***Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

У **жніўн**і адбылася прэзентацыя паэтычнага зборніка “Автографы Родины” членаў аматарскага аб’яднання паэтаў “Млын”, прысвечаная 50-годдзю г. Новалукомля (*Новалукомльская гарадская бібліятэка*).

*Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк*

**20 жніўня** Літаратурная вандроўка "Путешествие по Книжной стране" (*Бароўская сельская бібліятэка*).

**21 жніўня** Віртуальная вандроўка "Прогулки по планете: Америка" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**22 жніўня** Медыяўрок па правілах дарожнага руху "Знаки всякие важны, знаки всякие нужны" (*Каменская сельская бібліятэка-музей Т. Кляшторнага*).

**29 жніўня** Прэзентацыя кнігі М. Яршова "Огонь и пепел" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**13 верасня** Свята вёскі Велеўшчына "Тут мая вёска, мае карані" (*Велеўшчанская сельская бібліятэка-клуб*).

**14 верасня** Літаратурны вечар "Душ человеческих добрые лекари" (*Баброўская сельская бібліятэка-музей Я. Мароза*).

**15 верасня** Дзень адчыненых дзвярэй "Центральная библиотека г. Лепеля в реальном и виртуальном пространстве" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк***

**19 жніўня** супрацоўнікі *цэнтральнай раённай бібліятэкі* запрасілі чытачоў і ўдзельнікаў народнага клуба кветкаводаў і садаводаў-аматараў "Флора" на мерапрыемства **"**Яблочный Спас встречаем, лето провожаем".

**15 верасня** Сацыяльна-культурная акцыя "Библиосумерки-2014" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**26 верасня** Семінар для супрацоўнікаў сельскіх бібліятэк раёна "Духовно-просветительская работа библиотек на современном этапе".

***Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**15 жніўня** Літаратурны вечар "Души высокая свобода", прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння Г. Ахматавай (*Пастаўская гарадская бібліятэка*).



**КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА.**

**САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ**

*КЛУБНАЯ СПРАВА*

**10 жніўня** ў парку Бяльмонты Браслаўскага раёна адбылося свята аграгарадка Ахрэмаўцы. Рухавіком гэтага мерапрыемства стаў мясцовы Цэнтр нацыянальнай культуры.

*Витебский вестник. – 2014. – 16 авг. – С. 13.*

**14 жніўня** на алеі па праспекце Францыска Скарыны ў г. Полацку прайшоў раённы экафэст "Мядовы Спас у Полацку-2014". Наведвальнікаў свята чакала забаўляльная праграма, а галоўная сцэнічная пляцоўка запрасіла на канцэрт. У праграме свята – дэгустацыя мёду і прадуктаў пчалярства, конкурс-дэгустацыя "Кантрольная закупка", конкурс касцюмаў.

*http://www.pvestnik.by/?p=17484*

**16–17 жніўня** г. Новалукомль Чашніцкага раёна адзначыў 50-гадовы юбілей. У час святкавання адбыліся наступныя мерапрыемствы: парад-шэсце прадстаўнікоў працоўных калектываў, тэатралізаванае прадстаўленне "Люблю тебя, горжусь тобой, мой город, сердцу дорогой", працаваў горад майстроў, адбыліся выступленні спевака і кампазітара з г. Лепеля *А. Балотніка*, традыцыйны конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні "Звездный дождь" і інш.

*Витебский вестник. – 2014. – 12 авг. – С. 1, 5.*

**16 жніўня** прайшло дзясятае па ліку свята гарпасёлка Падсвілле "Падсвільскі світанак", прысвечанае 90-годдзю населенага пункта. Тэатралізаванае прадстаўленне, гонкі на тарантасах, канцэртная праграма эстраднага ансамбля "Вдохновение" (г. п. Ушачы), дзіцячае свята "Радуга талантов" (Падсвільскі ДК), выступленне народнага ансамбля народнай песні "Заманіха" (г. Полацк), канцэрт-віншаванне ад творчых калектываў Падсвільскага ДК "С юбилеем тебя, поселок!", выступленне вакальна-харэаграфічнага калектыва "Ростань" (г. Віцебск), святочны канцэрт

групы “Подсвильчанка” “10 лет вместе”, эстрадна-танцавальная праграма “Подсвильский хит-парад”.

*Веснік Глыбоччыны. – 2014. – 13 жн. – С. 8.*

**19 жніўня** адбылося раённае свята “Яблочный спас у Свято-Покровской церкви в Полоцке”. Удзельнікаў і гасцей чакалі конкурсы і сюрпрызы, дэгустацыя, кулінарныя майстар-класы, абмен рэцэптамі і інш. На тэрыторыі гарадскога парка культуры і адпачынку быў прадстаўлены фотапраект для ўсёй сям’і “Яблоко от яблони…”.

*http://www.pvestnik.by/?p=17557*

У аграгарадку Мацюшы ў **жніўні** ў рамках свята вёскі калектыў Полацкага раённага Дома культуры правёў творчую акцыю “Моим землякам”. У яе рамках прайшоў канцэрт-віншаванне з лепшых нумароў мастацкай самадзейнасці “Полотчина – дом для всех”.

*Полацкі веснік. – 2014. – 22 жн. – С. 23.*

**21 жніўня** ў г. Барань Аршанскага раёна адбыўся фестываль-свята дзіцячай творчасці “Радуга надежды”. Свята праводзілася ў мэтах развіцця мастацкай творчасці дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі як сродак іх рэабілітацыі і сацыяльнай адаптацыі ў грамадстве. Фестываль праводзіўся па некалькіх відах дзіцячай творчасці: бісерапляценне, работа з тканінай і ніткамі, лозапляценне, лепка, выкананне вітражнага роспісу па шкле. У праграме святочнага канцэрта фестывалю прынялі ўдзел юныя артысты Палаца культуры: удзельнікі ўзорнага танцавальнага калектыву “Адамант”, выхаванцы дзіцячага ўзорнага тэатра “Вясёлка”, салісты дзіцячай вакальнай студыі ДК.

*Телеком-экспресс (Орша). – 2014. – 28 жн. – С. 30.*

**23 жніўня** ў в. Алашкі Шаркаўшчынскага раёна прайшло раённае свята “Светлый Яблочный Спас – сикоровской души частица”, прысвечаны памяці земляка, садавода-селекцыянера І.П. Сікоры. Праграма мерапрыемства ўключала асвяшчэнне яблыкаў новага ўраджаю, наведванне мемарыяльнага музея, сюжэтна-гульнёвую праграму ”Авангардзізм-2014”, работу літаратурнай гасцінай, дзіцячай пляцоўкі,



грэюць добрым словам”, прымеркаванае да Дня бібліятэк. У праграме: латарэя-сюрпрыз “Натхненне сэрца і душы”, інтэлектуальна-гульневы конкурс “Зачараваныя кнігай”, лялечны спектакль “З далекай даўніны”, творчы вечар загадчыцы *Кіраўскай сельскай бібліятэкі* Наталлі Салаўёвай “На перекрестке звезд и судеб” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

### *Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэка*

**2 верасня** Дзень інфармацыі “Свет ведаў кніга адкрывае” (*Гарадоцкая дзіцячая бібліятэка*).

**27 верасня** ў рамках абласнога фестывалю-ярмаркі працаўнікоў сельскай гаспадаркі “Дажынкі-2014” працавала літаратурная пляцоўка “Край мар маіх і думак светлых – мая Радзіма Беларусь”, на якой супрацоўнікі *цэнтральнай раённай бібліятэкі* прадставілі кніжную кампазіцыю з фотаматэрыяламі “Творчы талент нашага земляка”, прысвечаную 75-годдзю паэта У. Скарынкіна. На пляцоўцы адбылася сустрэча паэта з гасцямі свята. Гучалі вершы і песні знакамітага земляка ў выкананні тэатральнай студыі “Фонограф”, вакальнай групы “Радуга”, народнага ансамбля песні і танца “Яблонька”.

### *Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк*

У **жніўні** ў бібліятэках раёна адбыліся наступныя мерапрыемствы: гульнёва-забаўляльная праграма “Спас – яблычка прыпас” (*сельская бібліятэка аграгарадка Буда*), конкурсна-гульнёвая праграма па казках С.Я. Маршака для чытачоў малодшага школьнага ўзросту “Царство добрых книг” (*сельская бібліятэка аграгарадка Чырына*) і інш.

У **верасні** бібліятэкарамі раёна былі праведзены бенефіс чытача “Созвездие лучших читателей” (*цэнтральная раённая бібліятэка*), урок роднай мовы “Казкі новага стагоддзя” (*сельская бібліятэка-музей ільну аграгарадка Баброва*), свята “Её величество картошка” (*сельская бібліятэка аграгарадка Буда, Будскі сельскі Дом культуры*).

дзейнасці розных культурна-асветніцкіх устаноў і арганізацый раёна” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**1–10 верасня** Дэкада беларускай кнігі. У праграме: кніжная выстаўка “Не знікне цуд прыгожага пісьменства”, прагляд літаратуры “Кніга – розуму крыніца, царства ведаў і ідэй”, чытацкая канферэнцыя “Кніга. Час. Мы”, літаратурная старонка “Сучаснае беларускае апавяданне” (*Відзаўская гарпасялковая бібліятэка*).

**5 верасня** Сустрэча з паэтам *Зянонам Бурым* (Латвія) (*цэнтральная раённая бібліятэка, УА “Браслаўская гімназія”*).

**12 верасня** Святочнае мерапрыемства “Мая прафесія – мой гонар”, прымеркаванае да Дня бібліятэк Беларусі і 70-годдзя цэнтральнай бібліятэкі. Падчас свята прайшла акцыя “Стань бліжэй да бібліятэкі”, стартаваў букросінг, адбылося ўшанаванне ветэранаў бібліятэчнай справы, флэшмоб “Абдымі сваю бібліятэку” і інш. (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**28 верасня** Прэзентацыя буклета “Гераічныя імёны Браслаўшчыны”, прысвечаная 70-годдзю вызвалення Беларусі (*Мяжанская сельская бібліятэка*).

***Віцебская раённая сетка публічных бібліятэка***

**6 жніўня** Навучальны семінар-практыкум для бібліятэчных работнікаў “Усе разам супраць СНІДу” з удзелам урача-эпідэміёлага аддзела прафілактыкі ВІЧ/СНІД “ДУ ВОЦГЭ і ГЗ” Г.В. Жарыкавай (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**19 жніўня** Тэматычная юрыдычная кансультацыя “Вырашаем праблему разам. Навіны заканадаўства” з удзелам стажораў-адвакатаў гарадской калегіі адвакатаў юрыдычнай кансультацыі № 1 г. Віцебска А.В. Аксёнавым і В.Л. Калінай (*Мазалаўская сельская бібліятэка*).

**24 жніўня** Тэатралізаванае прадстаўленне для дзяцей і падлеткаў “Свята Няптуна” (*Сасноўская сельская бібліятэка*).

**12 верасня** Раённае свята “Тут кнігі радуюць сяброў і душы



фальклорна-гульнёвага дворыка і інш. Кульмінацыяй свята стала ўрачыстая цырымонія адкрыцця ў доме садавода экспазіцыі мемарыяльнага музея.

*Витебский вестник. – 2014. – 26 авг. – С. 8.*

Традыцыйны **фестываль народнай творчасці “Збіраем зорны карагод”** адбыўся **24 жніўня** ў аграгарадку Валынцы Верхнядзвінскага раёна ў гэтым годзе ў сёмы раз і папоўніўся святам вёскі. У Год гасціннасці святкавалі разам з суседзямі: дэлегацыяй Дагдскага краю і вакальным ансамблем “Гамма” (Латвія), вакальным ансамблем “Сударушка” з п. Ідрыца Себежскага раёна (Расійская Федэрацыя) і калектывам “Перабродскія дзяўчаты” з Міёрскага раёна. Свае таленты гледачам дарылі вакальныя групы сельскіх Дамоў культуры: “Натхненне” Запруддзеўскага, “Вяснянка” Антонаўскага, “Калінушка” Шайцераўскага, “Вясёлы настрой” Асвейскага, “Натхненне” Боркавіцкага, “Зорны дождж” Бігосаўскага, “Спадчына” Валынецкага.

*Витебский вестник. – 2014. – 2 сент. – С. 5.*

*Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2014. – 29 жн. – С. 7.*

**24 жніўня** ў в. Сакольнікі Мазалаўскага сельскага Савета прайшло свята вёскі. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі работнікі Мазалаўскага Дома культуры і дзіцячай школы мастацтваў. Перад вяскоўцамі выступілі ўдзельнікі народнага ансамбля народнай песні і музыкі “Вераснянка”, вакальнага калектыву “Крыніцы”, інструментальнага ансамбля “Балагуры”. З музычнымі падарункамі выходзілі на сцэну вучні дзіцячай школы мастацтваў.

*Витебский вестник. – 2014. – 28 авг. – С. 23.*

**30 жніўня** адбылося свята “Святкуе Мосар юбілей. Красуйся, слаўся і квітней!”, прысвечанага 500-годдзю в. Мосар. Падчас святочных мерапрыемстваў быў адкрыты памятны знак, прайшла акцыя пасадкі дрэў “Аллея к юбилею”, адкрыты сацыяльны аб’ект для адзінокіх людзей, канцэрт “Музыка – душа поэзии”.

*Веснік Глыбоччыны. – 2014. – 27 жн. – С. 1.*

Самадзейныя артысты Лёзненшчыны прынялі ўдзел у раённым свяце самадзейнай народнай творчасці і самабытнага гумару "З невычэрпнай кайстры Несцеркі", якое адбылося **7 верасня**.

*Сцяг Перамогі (Лёзна). – 2014. – 9 верас. – С. 5.*

З **8** па **14 верасня** жыхары і госці г. Міёры святкавалі 500-годдзе з моманту першага ўпамінання населенага пункта ў гістарычных дакументах. Падчас святкавання ў горадзе адбыліся экалагічны брэйн-рынг "Богатства Миорского края", конкурс майстэрства маладых аўтааматараў "Осенний автобатл", конкурс сярод маладых сямей "Уладар сяла" і іншыя мерапрыемствы. **14 верасня** ў г. Міёры прайшло **III абласное экалагічнае свята-конкурс "Жураўлі і журавіны Міёрскага краю"**. У праграме свята: дзіцячая цыркавая праграма, конкурс падвор'яў "Богатство Ельни на нашем подворье", конкурсная шоу-праграма "Міёрская журавінка", рыцарскі турнір з удзелам клубаў гістарычнай рэканструкцыі, выступленне харэаграфічнага ансамбля Мінскай дзяржаўнай філармоніі "Харошкі", арт-групы "Беларусы", групы "J:морс" і інш. Музычнымі падарункамі віншавалі міярчан артысты з Расіі, Латвіі, Браслаўскага, Шаркаўшчынскага, Полацкага, Верхнядзвінскага раёнаў.

**12–13 верасня** жыхары г. Докшыцы адзначалі 607-годдзе населенага пункта. У час святкавання адбыліся наступныя мерапрыемствы: VI Партнерыят прадпрымальнікаў прыгранічных рэгіёнаў: Расія–Латвія–Эстонія–Беларусь, на Цэнтральнай плошчы горада і ў парку працавалі тэматычныя пляцоўкі: алея "Докшыччына гасцінная", "Смачны фальварак", "Дзіцячы гарадок", "Горад танцаў", раённая выстаўка-конкурс кветкавых кампазіцый "Твой і мой квітнеючы горад", прайшлі выступленні творчых калектываў г. Докшыцы і г. Балві (Латвія), фінал раённага агляду-конкурсу дыскатэчных праграм "Залатая вяртушка-2014".

*Родныя вытокі (Докшыцы). – 2014. – 16 сент. – С. 1.*

З **12** па **14 верасня** ў г. Віцебску праходзіла **міжнародная канферэнцыя "Арт-Лімуд Беларусь"**. Другі раз горад прымаў гасцей з



малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту былі праведзены ўрокі дарожнай азбукі "Знай правила дорожного движения, как таблицу умножения".

**15–21 верасня** У рамках Тыдня бібліятэк адбыліся наступныя мерапрыемствы: Дзень прафесіі "Я сёння бібліятэкар" (*бібліятэка імя К. Сіманава*); акцыі "Стань чытачом!" (*цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага,)* "З адкрытым сэрцам, з добрым словам" (*бібліятэка імя У. Караткевіча*), "Хутка ў бібліятэку" (*бібліятэка імя С. Маршака*); у *дзіцячай бібліятэцы імя С. Маршака* адкрыўся лялечны тэатр "Церамок"; бібліяэстафета (*дзіцячая бібліятэка імя А.С. Пушкіна*); вечар беларускага гумару "Беларусы смяюцца" (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя У. Маякоўскага*) з удзелам самадзейных артыстаў гарадскога аб'яднання інвалідаў, народнага калектыву "Крылы" і гарадскога клуба пажылых людзей "Ещё не вечер" і інш.

**25–26 верасня** супрацоўнікі *бібліятэкі імя К. Сіманава* прымалі ўдзел у гарадскім кірмашы здароўя, прадставіўшы кніжную выстаўку "Лад жыцця – толькі здаровы", прысвечанную самым разнастайным методыкам па здаровым ладзе жыцця і правялі акцыю "Кніга ў падарунак Вам, хто любіць чытаць і хоча быць здаровым".

### *Аршанская раённая сетка публічных бібліятэка*

**18 жніўня** ў рамках "Школы информационного комфорта" праведзена сацыялагічнае даследаванне "Периодика. Ваше мнение, читатель" (*дзіцячая бібліятэка імя У. Караткевіча*).

**19 жніўня** Фальклорнае свята "Прыйшоў Спас – дзецям яблычка прыпас" (*бібліятэка № 10*).

### *Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэка*

**26 жніўня** Краязнаўчая канферэнцыя "Сучасныя здабыткі ў даследванні гісторыі, археалогіі, этнаграфіі Браслаўшчыны і краязнаўчай

***Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк***

**14 жніўня** Акцыя да Міжнароднага дня абароны бяздомных жывёл “Дзеці супраць жорсткасці” (*бібліятэка імя П. Броўкі*).

**2 верасня** Літаратурна-паэтычная кампазіцыя “Францыск Скарына – слаўны сын Беларусі” (*бібліятэка імя П. Броўкі*).

**15 верасня** ў межах акцыі “Бібліяноч-2014” адбыліся наступныя мерапрыемствы: бібліятэчнае дэфіле “Усё цудоўна” з удзелам “Тэатра моды” УА ВГПТК і плэй-шоу “Легенда пра кветкі”, дэманстрацыя фільма “Воровка книг” па рамане М. Зузака, літаратурнае кафэ “Прытулак кнігачэя” прапанавала сустрэчу з паэтычным словам, экспазіцыя работ, выкананых у тэхніцы энкаўстыкі, чытачкі бібліятэкі В.А. Куряковай, а чытальная зала прадставіла арт-аб’ект “Через науки, страны и века течёт к нам книжной мудрости река”.

У межах акцыі ў праекце “Кнігі майго жыцця” прайшла сустрэча з мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа В. Анісенкам і вядучым майстрам сцэны Ю. Цвіркам. марафон “Дзякуй за Перамогу”, віртуальны праект “Прагулкі па Віцебску” з удзелам краязнаўца А. Падліпскага і фатографа В. Барысенкава, сустрэча з удзельнікамі спектакля “Королева красоты” (рэжысёр І. Баярынцаў). Сваю аўдыторыю прыхільнікаў сабраў народны тэатр-студыя аўтарскай песні ДУ “Цэнтр культуры Віцебск”, літаратурна-забаўляльная праграма «Бібліятэчныя прыцемкі “Кніжкі чытай – свет пазнавай”» (*бібліятэка імя Еўфрасінні Полацкай*), супрацоўнікі *дзіцячай бібліятэкі імя Я. Коласа* наведалі выхаванцаў сацыяльна-педагагічнага цэнтра № 1 і прапанавалі прыняць удзел у літаратурнай гульні “Пераблытаныя казкі” і інш.

***Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк***

**17 жніўня** Дзень дапамогі прытулку жывёл “Чаще всего друг протягивает тебе лапу, а не руку” (*бібліятэка г. п. Баравуха*).

**25** і **28 жніўня** ў *бібліятэцы імя К. Сіманава* для чытачоў



розных куткоў Беларусі, Украіны, Малдовы, Літвы, Расіі, Вялікабрытаніі, Ізраіля, ЗША і іншых краін – усяго каля 650 чалавек. Адразу на некалькіх пляцоўках прайшлі розныя мерапрыемствы: круглыя сталы, канцэрты, творчыя сустрэчы, лекцыі-гутаркі, выстаўкі, інтэлектуальныя гульні, майстар-класы.

*Витебский вестник. – 2014. – 16 сент. – С. 3.*

**13 верасня** адзначаў 510-годдзе г. Чашнікі, сваімі талентамі ўдзельнікаў святочных мерапрыемстваў радавалі Тэатр песні Ірыны Дарафеевай, Саша Нема, Чашніцкая дзіцячая школа мастацтваў, калектывы гарадскога Дома культуры, артысты з г. Наваполацка.

*Витебский вестник. – 2014. – 18 сент. – С. 10.*

Аршанскі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі ў верасні адзначыў 90-годдзе з дня заснавання і 65 гадоў з дня адраджэння.

*Аршанская газета. – 2014. – 11 верас. – С. 4.*

*ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ*

**5 верасня** супрацоўнікі Віцебскага абласнага краязнаўчага музея правялі традыцыйнае **абласное свята-конкурс мастацкага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва для людзей з абмежаванымі магчымасцямі “Сонечны свет для ўсіх”**. На выстаўцы, якая доўжылася з 3 па 30 верасня, былі прадстаўлены больш за 400 творчых работ інвалідаў з 24 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва раёнаў Віцебскай вобласці і г. Віцебска, а таксама 5 абласных таварыстваў інвалідаў (графіка і жывапіс, дэкупаж, драўляная і керамічная скульптура, мяккая цацка, кераміка, квілінг, вышыўка, вязанне, вырабы з бісеру і інш.). Пашырыліся ўзроставыя рамкі ўдзельнікаў ад 15 да 45 гадоў і старэй. У музеі-сядзібе І.Я. Рэпіна “Здраўнёва” ўдзельнікаў конкурсу чакалі тэатралізаваныя экскурсіі па музеі ад навучэнцаў каледжа культуры і мастацтваў, майстар-класы па жывапісе, лепцы, ад мастакоў і студэнтаў мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава і іншыя мерапрыемствы.

У г. Лепелі 7 **верасня** ўпершыню прайшоў **фестываль беларускай міфалогіі “У госці да Лепельскага Цмока”**. Арганізатар фестывалю – Лепельскі райвыканкам пры ўдзеле кампаніі “Будзьма беларусамі!”. Удзельнікам былі прапанаваны творчыя майстэрні, музычна-этнаграфічныя праграмы, пазнавальныя віктарыны з адметнымі прызамі, забаўкі для дзяцей і навукова-практычная канферэнцыя для больш сур’ёзных аматараў міфалогіі. З музычнай праграмай фестываль наведалі ансамбль народнай музыкі, песні і танца “Рэй”, тэатр старажытнай культуры “Яварына”, гурты “Рокаш”, “Рэха” і “Handmade”.

**12 верасня** ў гарадскім Цэнтры культуры г. Докшыцы адбыўся **абласны агляд-конкурс вакальна-інструментальных ансамбляў “ВІAton-2014”**. У намінацыі “Лепшая інструментальная рок-кампазіцыя” перамог панк-рок-гурт “Фрегат” Віцебскага раённага Дома культуры, у катэгорыі “За прапаганду беларускай песні” – ВІА “Огни маяка” Пагашчанскага СДК Браслаўскага раёна. Лепшую джаз-кампазіцыю прадставіў ансамбль “Диксиленд” Бешанковіцкай дзіцячай школы мастацтваў. Рок-гурт “Эксперимент-12” Шумілінскага РДК атрымаў дыплом лаўрэата І ступені ў намінацыі “Лепшы рок-гурт”. Лаўрэат І ступені ВІА “Колеры” Наваполацкага цэнтра культуры быў адзначаны дыпломам у намінацыі “Лепшая аранжыроўка”, ВІА “Cotton Buds” Докшыцкай дзіцячай школы мастацтваў атрымаў дыплом лаўрэата ІІІ ступені. Вакальна-інструментальны ансамбль “А5” Вусценскага сельскага Дома культуры Аршанскага раёна стаў лаўрэатам ІІ ступені.

*Віцебскі АМЦНТ*

*Витебский вестник. – 2014. – 23 сент. – С. 8.*

Трэці **фестываль сямейнай творчасці “Талантливы вместе” 20–21 верасня** сабраў у г. Віцебску калектывы з Беларусі і Расіі. 14 калектываў выйшлі ў фінал і ўсе былі адзначаны журы. Трэці фестываль аб’яднаў 133 удзельніка, з якіх 116 прыехалі з іншых гарадоў (Петразаводска, Мурманска, Тамбова, Саратава, Мінска, Гомеля, Бабруйска і інш.). Віцебск прадстаўлялі 5 сямей (сярод якіх – сямейны



квартэт “СМАЙЛ”, дуэт “ANSVEL”, сям’я Кулаковых).

**27 верасня** ў г. Гарадку адбыўся **абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі “Дажынкі-2014”**. Фестываль пачаўся святочным шэсцем па вуліцах Пралетарская, Савецкая. Затым на цэнтральнай канцэртнай пляцоўцы адбылося ўрачыстае адкрыццё свята. На іншых пляцоўках – медыяфорум “Рэпартаж са жніўнага поля”, выстаўка сельскагаспадарчай тэхнікі, выстаўка-прэзентацыя “Віцебшчына турыстычная”, літаратурная пляцоўка “Край маіх мар і думак светлых – мая радзіма – Беларусь!”, абласная кніжная выстаўка пісьменнікаў Віцебшчыны і навінак літаратуры, тэатралізаваныя святы брэндаў раёнаў і гарадоў вобласці, у скверы каля Дома рамёстваў устаноўлена скульптура героя паэмы “Тарас на Парнасе”, канцэртныя праграмы, грамадска-культурная акцыя “Горад – вёсцы”, выстаўка-кірмаш народных майстроў, праект “Віцебскія падвор’і” і інш.

*Віцебскі АМЦНТ*

## *БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

### ***Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна***

**5 жніўня** ў бібліятэцы адбылося адкрыццё выстаўкі жывапісу члена Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь *Галіны Васільевай* “Гарадскі раманс”.

**15–18 верасня** ў ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна” прайшлі мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня бібліятэк Беларусі: бібліятэчныя выстаўкі, акцыі, літаратурныя сустрэчы, экскурсіі па бібліятэцы. **15 верасня** адбылася прэзентацыя электроннага рэсурса Віцебскай абласной бібліятэкі “Дарогамі вызвалення Віцебшчыны”, прысвечанага 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. **17 верасня** – прэзентацыя кнігі “Встреча” паэтэсы, лаўрэата Усерасійскай літаратурнай прэміі, старшыні Віцебскага абласнога аддзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі” Т.І. Красновай-Гусачэнкі. **18 верасня** прайшла вечарына памяці “И в песне город над Двиной...”: да 100-годдзя з дня нараджэння кампазітара Марка Фрадкіна.